жр 3216 07
208
Библиотека АН БССР

СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ | ПРАЧЫТАЙ І ПЕРАДАЙ ДРУГОМУ

№ 16 (656)

# ГОЛАС ПАРТЫЗАНА

Субота 10 Ліпеня 1943 года.

ОРГАН ДАМАНАВІЦКАГА РАЙКОМА КП(б)Б

## СЛАЎНАЯ ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ НАНОСІЦЬ ВОРАГУ НОВЫЯ САКРУШАЛЬНЫЯ ЎДАРЫ

### З аператыўных зводак Соўінфармбюро з 5 па 8 ліпеня

### За 4 дні баёў па папярэднім дзеным знішчана 1573 танкаў, 1070 самалётаў ворага

З раніцы 5 ліпеня нашы войскі на Орлоўска-Курскім і Белгарадскім напрамках вялі ўпорныя баі з перайшоўшым у наступленне буйнымі сіламі пяхоты і танкаў ворага, падтрыманых вялікай колькасцю авіяцыі. Усе атакі праціўніка адбіты з вялікай для яго стратамі, і толькі ў асобных месцах невялікім атрадам немцаў удалося незначна ўклініцца ў нашы абароны.

Па папярэднім даным нашымі войскамі на Орлоўска - Курскім і Белгарадскім напрамках за дзень падбіта і знішчана 586 варожых танкаў. У паветраных баях і зенітнай артылерыяй збіта 203 самалёты ворага.

На Орлоўска-Курскім напрамках байцы Н-га злучэння адбівалі ажэстачоныя атакі ворага. На адным участку невялікаму атраду немцаў удалося на 0,5 кілометра ўклініцца ў пярэдні край нашай абароны. Сасрэдзіточаным агнём артылерыі і контрударам стралковых часцей далейшае прасоўванне ворага спынена. На другіх участках немцы кінулі на дапамогу сваей пяхоты вялікую сілу танкаў і авіяцыі, але не дабіліся поспеха. Жорсткая атака гітлераўцаў адбіта.

***

На працягу 6 ліпеня нашы войскі на Орлоўска - Курскім і Белгарадскім напрамках працягвалі весці ўпорныя баі з буйнымі сіламі танкаў і пяхоты ворага. Наступленне ворага падтрымлівалася вялікай колькасцю авіяцыі. На Орлоўска - Курскім напрамках усе атакі праціўніка адбіты з вялікімі для яго стратамі.

На няпоўным даным нашымі войскамі на Орлоўска - Курскім і Белгарадскім напрамках за дзень баёў падбіта і знішчана 433 нямецкіх танкаў. У паветраных баях і зенітнай артылерыяй збіта 277 самалётаў ворага. Уласна ў палон 22 нямецкіх лётчыка.

***

На Орлоўска - Курскім напрамках байцы Н-га злучэння другі дзень адбіваюць непарыўныя атакі танкаў і пяхоты ворага і стойка ўтрымліваюць свае пазіцыі. На ўчастку фронта, займаемым гэтым злучэннем, немцы, пасля артылерыйскай падрыхтоўкі, пусцілі ў бой да 400 танкаў. У ходзе сражэння нашы артылерысты, пехацінцы і бронебойшчыкі падбілі і знішчылі 110 варожых танкаў і істрабілі да 3000 нямецкіх салдат і афіцэраў. На другіх участках Орлоўска - Курскім напрамках усе спробы немцаў прарвацца за пярэдні край нашай абароны тэрпелі няўдачу.

Совецкія байцы і камандзіры праяўляюць стойкасць і мужнасць у барацьбе з ворагам.

***

На працягу 7 ліпеня нашы войскі на Орлоўска - Курскім і Белгарадскім напрамках вялі ўпорныя баі з ворагам працягваючым наступленне буйнымі сіламі танкаў і пяхоты. Наступленне немцаў падтрымлівалась вялікай колькасцю авіяцыі, дабавачна перакінутай з другіх франтоў. На працягу ўсяго дня вяліся жорсткія паветраныя баі. На Орлоўска-Курскім напрамках усе атакі праціўніка поспеха не мелі.

Нашымі войскамі на Орлоўска - Курскім і Белгарадскім напрамках за дзень баёў падбіта і знішчана да 520 нямецкіх танкаў. У паветраных баях і зенітнай артылерыяй збіта 229 самалётаў ворага.

На асобных участках некалькі груп нямецкіх танкаў па 15 - 30 машын, прарвалісь праз баявые парадкі нашых часцей у глыбіню абароны. К ісходу дня ўсе прарваўшыя танкі былі знішчаны. Сярод знішчаных больш 40 машын тыпа «Тыгр». Совецкія байцы і камандзіры паказваюць прыклад храбрасці і геройства.

***

На Белгарадскім напрамку раніцай немцы пасля гадзіннай артпадрыхтоўкі аднавілі наступленне. Сражэнне прыняло крайне напружаны характар. Асобныя населеныя пункты, выгадныя рубяжы і высоты па некалькі раз пераходзілі з рук у рукі. На працягу дня немцы бесперапынна падцягвалі падмацаванні свеім патрапаным дывізіям і кідалі іх у атакі.

На адным участку вораг да ісходу дня незначна прасунуўся ўперад і заняў асобныя вёскі. Нашы войскі перайшлі ў контратаку і вядуць баі за ўстанаўленне палажэння.

***

У Італьянскай марской базе ў Брамзе сярод матросаў ўспыхнула хваляванне. Каманда аднаго вайсковага карабля адмовілась выканаць баевое заданне, патрабаваўшы ўдалення з флота нямецкіх кантралёраў.

***

На працягу 8 ліпеня нашы войскі на Орлоўска - Курскім і Белгарадскім напрамках працягвалі весці баі з наступаючым буйнымі сіламі ворага. На працягу ўсяго дня вяліся ажэстачоныя паветраныя баі.

Усе атакі ворага былі адбіты. Нашы войскі выбілі ворага з асобных пунктаў, занятых ім у першы дзень наступлення і палепшылі свае пазіцыі.

За дзень баёў падбіта і знішчана 34 варожых танка. Збіта 161 самалёт.

# МАНЕЎРАНАСЦЬ, СМЕЛАСЦЬ І АДВАГА—РАШАЮЦЬ ПОСПЕХ БОЯ

# ПАРТЫЗАНЫ! Трымайце камунікацыі ворага пад строгім кантролям

## Пачаставалі непрошаных гасцей

Разведка далажыла, што ў населёны пункт Л. ўварваліся фашысцкія бандыты карнага атрада. Народныя мсціўцы з атрадаў Ч. і С. зрабілі засаду.

Гітлераўскія непрошаныя нахлебнікі награбілі ў сялян гусей, курэй, свінней і гарачым тэмпам варочаліся у сваё звярынае логва. Разведка з паліцаяў ішла ўперадзі, а іх гаспада—фрыцы труслівя ехалі ў заду калоны.

Раптам загрымеў залп. Кулямётнай чаргой партызаны зразу-ж пырасеклі варожую разведку. Немцы заметусілісь. Разгарэўся жорсткі бой. Нямецкія «ваякі» кінуліся на сваю хітрасць, яны імкнуліся акружыць партызан і нанесці ім смяротельны удар, але не ватых яны нарваліся. Байцы ўперад акружылі немцаў і шквалам гарачых куль частавалі іх.

П'яныя немчуры лезлі напропор, штурхаючы ўперад сваіх лакеяў—паліцаяў. Смелыя стралкі прыстрэльвалі падлаўзаючых ваюючых душагубаў.

Гітлераўцы не вытрымалі націску народных мсціўцаў, яны ў паніцы сталі ўцякаць, кідаючы награбленныя гусі, куры свінні, яйкі. У 2-х гадзінным баю з праўзыходзячай сілай праціўніка, якая складалася пераважна з немцаў-кадравікоў—эсэсаўцаў, партызаны забілі 22 гітлераўца, узялі трафеі і без сваіх страт звярнуліся ў сваё распалажэнні.

Валодзя.
Н-скі атрад.

## Жыццё гітлераўцаў не спакойнае

Немцы прымяняюць розныя метады па ахране чыгуначнай сеці. Яны пабудавалі дзоты, наставілі на варту адпетых гітлераўскіх сарвыгалаў, вырубілі ўздоўж чыгункі лес, пакасілі пасевы.

Тым часам зелёнамундзіршчыкі дрыжаць ад страху. Варожыя эшалоны адзін за другім ляцяць у адкос. Жыццё для гітлераўцаў на чыгунцы вельмі не спакойнае.

На маім рахунку лічыцца 4 чыгуначных аварыі. Яны нанеслі фашыстам не малы урон.

...Стаяла ціхая чэрвеньская ноч. Наша падрыўгрупа адправілась у путь. Рэльефнасць мясцовасці была не зламай. Падайці к чыгунцы з лесу было цяжка, там была ўзмоцненая варта. Немцы больш усяго вылупліваюць свае вочы ў лес. Мы падыйшлі да рэяк праз прасвет паляны і залажылі міну. У сатрасаючым выбуху трапчаў у адкосе паравоз з вагонамі, у абломках стонучы гаргаталі немцы.

У нашай рабоце быў такі выпадак. 2 вартавых агледзелі закладзенную пад рэйкі нашу міну. Яны вызвалі тэхніка. З прыходам «спецыяліста» раздаўся выбух. Тры немчуры кускамі паляцелі ў воздух.

Цікавай і захапляючай з'яўляецца падрыўная работа. У гэтай справе патрабуецца асноўнае — смеласць, вытрымаласць, жаданне.

Выконваючы першамайскі загад тав. Сталіна мы і надалей будзем павялічваць свой баевы рахунак, шкодзіць камунікацыі ворага, знішчаць жывую сілу і тэхніку гітлераўцаў.

Камандзір падрыўной групы К. В. К.
Н-скі партызанскі атрад.

## Выраdкі грамадзкасці

Усюды, дзе толькі урываюцца нямецкія галаварэзы, там чутны плач і енкі нашых людзей, замучаных фашыстамі.

У вёску З. уехалі аўтамашыны. Нямецкія ірада - забойцы тут-жа пачалі грабіць людскую маёмасць і насілаваць жанчын. Яны абясславілі маладую жанчыну Ч. У прысутнасці бацькоў і старшай сястры звярыныя насільнікі замучылі 14 гадовую дзяўчыну М.

СЕМЕН Ш.

## Атрымалі па заслугам

—Заданне будзе выканана, таварыш камандзір, —вырэзна адказаўшы старшы групы падрыўнікоў тав. Е. і тут-жа з байцамі накіраваўся ў путь.

Вось і шляхавая дарога. Асцярожна закладваецца міна—гасцінец шалудзівым фашысцкім сабакам.

У воддалі пачуўся гул матора. Байцы ў чаканні. —Мы вас пачастуем, — ціха прашаптаў падрыўнік Е.

Выбух раздаўся магутнай сілы. У паветра ўзляцела аўтамашына і тры паліцаі. Так тры выскрабкі людзкой погані атрымалі па заслугам.

Заданне было выканана.

Баявы рахунак падрыўной групы расце з кожным днём. Днямі байцы зноў знішчылі легкавую аўтамашыну з трымя фрыцамі.

№-скі атрад.

## ЗА МЯЖОЙ

### Высадка саюзных войск на астравах Трабрыанд, Выдларк і новая Георгія

Штаб камандвання ўзброенымі сіламі саюзнікаў у Паўднёва-Заходняй частцы Ціхага акіяна паведамляе, што войскі саюзнікаў занялі групы астравоў: Трабрыанд і Выдларк (паблізу ўсходняй канечнасці Новай Гвінеі). Войскі саюзнікаў занялі ўзбярэжжа заліва Насар на Новай Гвінеі і востраў Рендова (саламонавы астрава).

На астравах Трабрыанд і Выдларк вораг не аказаў супраціўлення. Адначасова войскі саюзнікаў высадзіліся на астравах Новая Георгія, дзе ў сучасны момант ідуць баі.

Усімі аперацыямі камандуе галоўнакамандуючы ўзброенымі сіламі саюзнікаў у Паўднёва-Заходняй частцы Ціхага акіяну генерал Макаргур.

Рэдкалегія
Выданне Дамачаўскага РК КП(б)Б
У— 85 Зак. 13